**М. У. ГУЛЬ**
Брэст, Брэсцкі дзяржаўны ўніверсітэт імя А. С. Пушкіна

# КАМПАЗІТЫ Ў СКЛАДЗЕ БЕЛАРУСКАЙ ГРАМАДСКА-ПАЛІТЫЧНАЙ ЛЕКСІКІ

Кампазіцыя з'яўляецца адным з прадуктыўных спосабаў папаўнення слоўнікавага складу беларускай мовы. Па меркаванні М. Р. Прыгодзіча, "дэрывацыйная сістэма сучаснай беларускай мовы вызначаецца значнай прадуктыўнасцю ва ўтварэнні інавацый тыпу composita" [2, с. 4].

Аднак адзінага разумення сутнасці кампазіцыі няма, што абумоўлена living рознымі падыходамі да словаскладання. Некаторыя даследчыкі (напрыклад, Л. А. Антанюк) лічаць найменні тыпу *марксізм-ленінізм* словазлучэннямі, пабудаванымі па мадэлі "назоўнік + дапасаваны назоўнік" [1, с. 192]. Л. М. Шакун, П. П. Шуба, Ф. М. Янкоўскі разглядаюць словаскладанне як разнавіднасць марфалагічнага спосабу. Мы падтрымліваем апошні пункт погляду. Згодна з меркаваннем Л. М. Шакуна, словы, утвораныя шляхам словаскладання, падзяляюцца на раздзельнааформленыя (скланяюцца абодва кампаненты) і адзінааформленыя (скланяецца толькі апошні кампанент) [3, с. 98].

У грамадска-палітычнай лексіцы словаскладанне сустракаецца пры ўтварэнні найменняў дзейнай асобы (раздзельнааформленыя адзінкі): *ідэаліст-агностык, ідэаліст-дыялектык, ідэаліст-метафізік, камуніст-утапіст, ліберал-кансерватар, лідар-гандляр, лідар-пажарны, лідар-служка, лідар-сцяганосец, лідары-агітатары, матэрыяліст-дыялектык, матэрыяліст-метафізік, метафізік-дагматык, сацыёлаг-марксіст, сацыёлаг-суб'ектывіст, сацыёлаг-эклектык, селянін-абшчыннік, селянін-аднаасобнік, філосаф-агностык, філосаф-дыялектык, філосаф-ідэаліст, філосаф-матэрыяліст, філосаф-метафізік, філосаф-наміналіст, філосаф-неапазітывіст, філосаф-прагматыст, філосаф-рэаліст, філосаф-экзістэнцыяліст, філосаф-эклектык, філосаф-эмпірык*. Кампазіты таксама называюць вучэнні: *марксізм-ленінізм*; паняцці палітычнай эканоміі: *зямля-капітал, зямля-тавар, капітал-уласнасць, капітал-функцыя*.

Асноваскладанне з'яўляецца адным з прадуктыўных спосабаў тэрмінаўтварэння. Асноўным (апорным) словам такіх кампазітаў звычайна з'яўляецца апошні кампанент, які часта роўны цэламу слову і служыць для марфалагічнага афармлення ўсяго складання.

Пры ўтварэнні назоўнікаў у якасці першай асновы выступаюць словы розных часцін мовы:

1) назоўнікі: *веравызнанне, волевыяўленне, светаадчуванне, светасузіранне*, *розумазаключэнне*;

2) прыметнікі: *дабрабыт, узаемаадносіны, узаемасувязь*;

3) займеннікі: *іншабыццё, самаўрад*;

4) лічэбнікі: *першапрычына*.

У грамадска-палітычнай лексіцы прадуктыўны тып складаюць назоўнікі-кампазіты з першым кампанентам ***сама-***: *самаадмаўленне, самаарганізацыя, самавыхаванне, самакіраванне, саманазіранне, самапазнанне, самарух, самасвядомасць, самасупярэчнасць*.

У сучасным словаўтварэнні даследчыкі разглядаюць словы, складзеныя з іншамоўных элементаў, як кампазіты. У грамадска-палітычнай лексіцы можна вылучыць словы з першым звязаным кампанентам грэчаскага ці лацінскага паходжання:

***антрапа-*** (ад грэч. *anthropos* – чалавек): *антрапасацыялогія, антрапасацыягенез*;

***бія-*** (ад грэч. *bios* – жыццё): *біясацыялогія*;

***макра-*** (ад грэч. *makros* – вялікі): *макрасвет*;

***мікра-*** (ад грэч. *mikros* – малы): *мікрасвет*;

***неа-*** (ад грэч. *neos* – новы): *неавіталізм, неагегельянства, неаглабалізм, неадарвінізм, неакаланіялізм, неакансерватызм, неакантыянства, неаканфуцыянства, неакейнсіянства, неакласіцызм, неакрытыцызм, неаламаркізм, неалібералізм, неамальтузіянства, неамарксізм, неамахізм, неанацызм, неаніцшэанства, неапазітывізм, неапіфагарэізм, неаплатанізм, неарацыяналізм, неарэалізм, неаславянафільства, неасхаластыка*;

***пан-*** (ад грэч. *pan* – усё): *панамерыканізм, панарабізм, панафрыканізм, пангерманізм, паніcламізм, панлагізм, панпсіхізм, панславізм, пантэізм, панцюркізм*;

***полі-*** (ад грэч. *poly* – многа): *полігенізм, політэізм, поліцэнтрызм*;

***пост-*** (ад лац. *post* – пасля): *постмадэрнізм, постпазітывізм*;

***псіха-*** (ад грэч. *psyche* – душа): *псіхаламаркізм, псіхаманізм, псіхарасізм*;

***рацыя-*** (ад лац. *ratio* – розум): *рацыявіталізм*;

***сацыя-*** (ад лац. *societas* – грамадства): *сацыябіялогія, сацыягеаграфія, сацыяметрыя, сацыясфера*;

***этна-*** (ад грэч. *ethnos* – народ): *этнасацыялогія, этнацэнтрызм*.

Зафіксаваны таксама кампазіты з першай іншамоўнай асновай ***нацыянал-*** (нацыянальны): *нацыянал-дэмакратызм, нацыянал-лібералізм, нацыянал-рэфармізм, нацыянал-шавінізм*; ***сацыял-*** (сацыяльны): *сацыял-дарвінізм, сацыял-дэмакратызм, сацыял-дэмакратыя, сацыял-патрыятызм, сацыял-пацыфізм, сацыял-фашызм, сацыял-утапіст, сацыял-рэвалюцыянер, сацыял-рэфармізм*.

Сярод тэрмінаў-кампазітаў сустракаюцца словы, утвораныя складаннем больш чым дзвюх асноў (*антрапасацыялогія, антрапасацыягенез,*

*этнасацыялогія*), што характэрна для тэрміналагічнай лексікі: "найбольшае пашырэнне шматасноўныя кампазіты атрымалі ў тэрміналогіі" [2, с. 22].

У якасці другіх састаўных частак складаных слоў выступаюць наступныя тэрмінаэлементы:

***-кратыя*** (ад грэч. *kratos* – улада): *агіякратыя, адхакратыя, гінекакратыя*;

***-лаг*** (ад грэч. *logos* – слова; вучэнне): *сацыёлаг*;

***-логія*** (ад грэч. *logos* – слова; вучэнне): *цюркалогія*;

***-фобія*** (ад грэч. *phobos* – страх): *русафобія*.

У межах кампазіцыі таксама вылучаецца асноваскладанне і суфіксацыя, ці складана-суфіксальны спосаб. У грамадска-палітычнай лексіцы зафіксаваны наступныя тыпы:

1) утварэнні з фармантам *-ств-а/-цтв-а*, якія абазначаюць дзейнасць, названую ў дзеяслоўнай аснове: *богастваральніцтва, богашукальніцтва, вальнадумства, вобразаборства, народапраўства*;

2) сацыяльныя ці філасофскія тэрміны з фармантам *-ств-а*: *мнагажонства, усеадзінства*;

3) утварэнні з фармантам *-j-э*, якія абазначаюць грамадскую з'яву: *адзінадзяржаўе, аднаўладдзе, вялікадзяржаўе, двухвер'е, мнагаўладдзе*;

4) утварэнні з фармантамі *-ец, -ц-а*, якія абазначаюць асобу: *адназемец, самаўладца, чужаверац, чужаземец, чужаплемец*.

Такім чынам, кампазіцыя з'яўляецца прадуктыўным сродкам папаўнення грамадска-палітычнай лексікі. Найбольш пашыранымі з'яўляюцца кампазіты з першым кампанентам *нацыянал-*, *сама-*, *сацыял-*. У спецыяльнай лексіцы набываюць прадуктыўнасць складанні са звязанымі кампанентамі грэка-лацінскага паходжання: *антрапа-*, *бія-*, *макра-*, *мікра-*, *неа-*, *пан-*, *полі-*, *пост-*; *-кратыя, -фобія* і інш.

*Спіс выкарастанай літаратуры*

1. Антанюк, Л. А. Беларуская навуковая тэрміналогія: фарміраванне, структура, упарадкаванне, канструяванне, функцыяніраванне / Л. А. Антанюк. – Мінск : Навука і тэхніка, 1987. – 240 с.

2. Прыгодзіч, М. Р. Словаскладанне ў гісторыі беларускай мовы : аўтарэф. дыс. … д-ра філал. навук : 10.02.01 / М. Р. Прыгодзіч ; БДУ. – Мінск, 2000. – 41 с.

3. Шакун, Л. М. Словаўтварэнне / Л. М. Шакун. – Мінск : Выш. шк., 1978. – 128 с.